©Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа

***Лісіца Н. М.**, настаўнік-дэфектолаг Гаранскага дзіцячага сада – сярэдняй школы Полацкага раёна Віцебскай вобласці*

# Падарожжа ў краіну чалавечых магчымасцей

## Карэкцыйныя заняткі ў IV класе
## (па праграме для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю
## (1 аддзяленне)

**Тлумачальная запіска.**

Адным з найважнейшых аспектаў дзейнасці настаўніка-дэфектолага з'яўляецца карэкцыйная праца, якая рэалізуецца праз арганізацыю карэкцыйна-накіраванага навучальна-выхаваўчага працэсу і сістэму карэкцыйных заняткаў. Мэта такіх заняткаў — павышэнне ўзроўню агульнага развіцця вучняў, выпраўленне прабелаў папярэдняга развіцця і навучання, карэкцыя адхіленняў у развіцці кагнітыўнай сферы, фарміраванне жыццёвай кампетэнцыі.

Паспяховасць дзіцяці ў засваенні школьнай праграмы залежыць ад стану развіцця яго пазнавальнай дзейнасці. У якасці асаблівых відаў пазнавальнай (унутранай) дзейнасці выступаюць пазнавальныя псіхічныя працэсы, накіраваныя на пазнанне сябе і навакольнага свету: увага, успрыманне, мысленне, памяць, маўленне, уяўленне. Такім чынам, стан развіцця пазнавальнай дзейнасці залежыць ад стану развіцця пазнавальных працэсаў. Авалоданне базавымі школьнымі навыкамі прадугледжвае таксама пэўны ўзровень развіцця дробнай маторыкі (дробнай маторыкі рукі і артыкуляцыйнай маторыкі) і моўнага аналізу і сінтэзу.

Пазнавальныя працэсы маюць структуру, аналагічную структуры любой іншай дзейнасці, г. зн. складаюцца з дзеянняў і аперацый і ўключаюць у свой склад адпаведныя ўменні і навыкі. Праца па развіццю пазнавальнай дзейнасці прадугледжвае фарміраванне менавіта пазнавальных уменняў (уменняў вылучаць істотныя прыкметы, вызначаць паслядоўнасць, параўноўваць, апісваць, арыентавацца на паперы, вызначаць прычынна-выніковыя сувязі і

інш.), а не ўменняў лічыць, пісаць і г. д., г. зн. не з'яўляецца проста дадатковай працай па вучэбных прадметах.

Заняткі па карэкцыі пазнавальнай дзейнасці ўключаюць у сябе практыкаванні і гульні па развіцці навыкаў, практыкаванні на развіццё маторыкі, адчуванняў, уяўленняў, мыслення, увагі, памяці, адвольнасці, на развіццё прасторавых уяўленняў, унутранага плану дзеянняў. Таксама на занятках выкарыстоўваецца навучальны матэрыял. Гэта вершы, тэксты, падлікова матэрыял, граматычныя заданні, іншыя заданні па школьнай праграме. Дадзеныя віды работ дапамагаюць ажыццяўленню мэтанакіраванай, дыферэнцыраванай карэкцыі пазнавальных псіхічных працэсаў вучняў.

На занятках па карэкцыі пазнавальнай дзейнасці ўдакладняецца значэнне новых паняццяў, слоў, працягваецца праца над тэкстам, прыказкамі і прымаўкамі, вобразнымі выразамі, разбіраюцца тэксты пра прыродныя з'явы, лад жыцця людзей, звяроў, птушак, іх знешні выгляд. Усё гэта прадугледжвае цесную сувязь з вучэбнымі прадметамі, такімі як руская мова, чытанне, «Чалавек і свет», матэматыка, выяўленчае мастацтва, працоўнае навучанне.

Карэкцыйная дзейнасць настаўніка-дэфектолага рэалізуецца менавіта ў працэсе работы з дзецьмі над заданнямі і заключаецца ў фарміраванні ў іх уменняў выконваць пэўную дзейнасць спачатку на падставе выкарыстання «памочнікаў» — тых ці іншых апор. Ужо само па сабе такое ўменне, як уменне дзіцяці выконваць цяжкую для яго дзейнасць, карыстаючыся апорай, — несумненна, значны вынік карэкцыйнай працы. Паступовая ж адмова дзіцяці ад выкарыстання апор на падставе росту яго самастойнасці пры выкананні дзейнасці — паказчык высокай якасці карэкцыйнай працы.

# Падарожжа ў Краіну чалавечых магчымасцей

***Мэта:*** павышэнне ўзроўню пазнавальнай актыўнасці і інтэлекту дзяцей.

***Задачы:***

- узбагаціць веды вучняў пра асаблівасці чалавечага мозгу;
- выявіць узровень сфарміраванасці памяці, мыслення, увагі, уяўлення;
- развіваць зрокавую і слыхавую памяць, мэтанакіраваную ўвагу, назіральнасць, лагічнае мысленне, дробную і агульную маторыкі;
- вучыць параўноўваць вынікі дзейнасці з узорам, працаваць у адпаведнасці з планам;
- стварыць умовы для выхавання дапытлівасці, цікавасці да наваколля, любві да сваёй малой радзімы.

***Абсталяванне:*** мультымедыйныя прэзентацыі; аўдыязапісы музыкі для рэлаксацыі, гукаў прыроды; маршрутны ліст; табліцы Шультэ, раздатачныя матэрыялы, крыжаванка, персанальныя камп’ютары або планшэты.

## I. Арганізацыйны этап.

— Добрай раніцы, сонейка ласкавае, добрай раніцы, сябры доўгачаканыя! Зараз мы адправімся з вамі ў падарожжа па Краіне чалавечых магчымасцей. Сядзьце зручна. Заплюшчыце вочы. Дыхайце спакойна і роўна. Давайце памаўчым і прыслухаемся да гукаў вакол. (Паўза.) Дыханне роўнае і спакойнае. Паслухайце, што я хачу вам расказаць…

***Рэлаксацыйны настрой «Паветраныя шарыкі».***

Настаўнік чытае пад музыку.

— Уявіце сабе, што вы — паветраныя шарыкі, вельмі прыгожыя і вясёлыя. Шарыкі лёгкія, бязважкія. І ручкі, і ножкі сталі лёгкія, лёгкія. Паветраныя шарыкі падымаюцца ўсё вышэй і вышэй… Дзьме цёплы ласкавы ветрык, ён пяшчотна абдымае шарыкі... Ветрык нясе шарыкі ў казачную краіну… І вось вы ўжо ў гэтай

краіне. Тут вас чакае шмат цікавага, неверагоднага. Уявіце гэта сабе… (паўза). Але вось прыйшла пара вяртацца дадому. Вы зноў у гэтым пакоі. Пацягніцеся, расплюшчыце вочы. Усміхніцеся свайму шарыку.

**II. Актуалізацыя ведаў вучняў.**

— Паглядзіце ўважліва на ***слайд 2*** і знайдзіце, хто лішні. Чаму? *(Чалавек, таму што ён разумная істота.)*

— Правільна. Толькі чалавек валодае сапраўдным розумам (***слайд 3***). Як вы думаеце, дзе ж у чалавека знаходзіцца розум? Дзе ён жыве? *(У галаве.)*

— Так, у галаўным мозгу. Гэта самы дзіўны орган чалавека. Дзякуючы яму, кожны з нас носіць у сабе цэлы свет! У любую хвіліну, нікуды не выходзячы з пакоя, мы можам уявіць і зорнае неба, і густы лес, і падводны свет акіяна. Хіба гэта не дзіўна? А ўсё таму, што наш мозг валодае чароўнымі ўласцівасцямі — пазнавальнымі. Гэтыя ўласцівасці крыху нам ужо знаёмыя. На кожным занятку мы імкнёмся іх развіваць. Прачытайце іх назву (***слайд 4***).




**III. Пастаноўка мэты заняткаў.**

— Дзякуючы гэтым уласцівасцям галаўнога мозгу, чалавек пазнае свет. Давайце адправімся хутчэй у падарожжа ў Краіну чалавечых магчымасцей, будзем развіваць гэтыя ўласцівасці, каб яны працавалі лепш. Для таго каб ваш

шлях быў больш прадуктыўным, існуе маршрутны ліст, дзе вы будзеце на кожнай станцыі пасля выканання задання выстаўляць адзнаку: + — усё зроблена правільна, +– — былі памылкі, – — нічога не атрымалася.

МАРШРУТНЫ ЛІСТ

| ЗАДАННЕ | АДЗНАКА |
|---|---|
| № 1 | |
| № 2 | |
| № 3 | |
| № 4 | |
| № 5 | |
| № 6 | |
| № 7 | |
| № 8 | |
| № 9 | |
| № 10 | |
| № 11 | |
| № 12 | |

**IV. Арганізацыя ўспрымання і асэнсавання новай інфармацыі.**

— Вось і пачалося наша падарожжа**.** Першая станцыя — гэта ўласцівасць чалавечага мозгу, якая дазваляе запамінаць, захоўваць і узнаўляць інфармацыю. Што гэта? *(Памяць.)* ***(Слайд 5.)***

— Правільна. Існуе некалькі відаў памяці, напрыклад зрокавая, слыхавая. Мы паспрабуем зразумець, як яны ў нас працуюць. Выканаем некалькі заданняў.

**Заданне 1. «Запомні, назаві».**

— Паглядзіце ўважліва і запомніце ўсё, што знаходзіцца перад вамі, вакол вас. Заплюшчыце вочы. Адкажыце на мае пытанні: якога колеру дошка? Ці ёсць у класе кветкі? Ці ёсць на вокнах фіранкі? Якога колеру дзверы ў шафах справа?

Расплюшчыце вочы, паглядзіце, ці ўсё правільна вы назвалі. Пастаўце адзнаку ў маршрутным лісце.

**Заданне 2. «Запомні знакі» (*слайд 6*).**

— Паглядзіце на малюнак і паспрабуйце запомніць знакі на ім. Намалюйце іх у сшытках. Параўнайце з малюнкамі на слайдзе.

**Заданне 3. «Запомні прадмет» (*слайд 7*).**

— Паглядзіце на слайд і паспрабуйце запомніць прадметы на ім, а потым назавіце, што запомнілі. Зрабіце высновы: ці трэба яшчэ папрацаваць над зрокавай памяццю?

**Заданне 4. «Запомні, паўтары».**

— Праслухайце словы і паўтарыце іх у любой паслядоўнасці: кінатэатр, паветра, восень, дзеці, дождж, тэлевізар. Ацаніце правільнасць адказу.

**Заданне 5. «Пазнай гукі прыроды».**

— Паслухайце ўважліва гукі прыроды і назавіце іх.

Праслухоўванне аўдыязапісаў.

— Зрабіце выснову, ці трэба развіваць, трэніраваць сваю слыхавую памяць? Як?

— Працягваем наша падарожжа. Мы прыбываем на наступную станцыю чалавечых магчымасцей. Гэта магчымасць дапамагае доўгі час уважліва разглядаць прадметы, выконваць заданні. Што гэта? *(Увага.)* ***(Слайд 8.)*** Як жа ў вас развітая ўвага? Праверым?

***Гімнастыка для вачэй.***

**Заданне 6. «Запомні фігуры і намалюй».**

— Уважліва паглядзіце на фігуры, якія будуць з'яўляюцца на экране, і паспрабуйце іх запомніць, а потым намаляваць (***слайд 9***).

— Праверце сябе (***слайд 10***).

***Гімнастыка «Су Джок».***

**Заданне 7. «Табліца Шультэ».**

— У вас на сталах табліцы з пераблытанымі лічбамі. Вам неабходна знайсці ўсе лічбы па парадку. Ацаніце работу.

— Зробім выснову: для чаго служыць чалавеку ўвага? Ці трэба яшчэ папрацаваць над увагай?

Працягваем наша падарожжа і прыбываем на станцыю, дзе магчымасць дапамагае нам уяўляць штосьці дзівоснае, складаць казкі, маляваць. Што гэта? *(Уяўленне.)* ***(Слайд 11.)***

**Заданне 8. «Дамалюй прадмет».**

— Перад вамі некалькі геаметрычных фігур (круг, авал, трохвугольнік), уключыце сваё ўяўленне і дапоўніце фігуры элементамі, каб атрымаўся які-небудзь вядомы прадмет. Ацаніце работу пасля кожнага задання.

***Фізкультхвілінка.***

**Заданне 9. «Адгадай прадмет па яго частцы».**

***Праца на персанальных камп'ютарах або планшэтах.***

— У гэтым заданні вам трэба будзе здагадацца, хто схаваўся на малюнку. Націскайце на квадрацікі, пазнайце, хто схаваўся.

— Ацаніце работу ў маршрутным лісце.

— Для чаго неабходна ўяўленне чалавеку? *(Каб добра маляваць, канструяваць, распавядаць.)*

— Зараз заплюшчыце вочы. Уявіце сабе, што чалавек апрануты ў плашч і ў яго руках парасон. Якая пара года хутчэй за ўсё на вуліцы? *(Восень.)* Як вы здагадаліся? *(Цёплае адзенне, парасон указвае, што ідзе дождж.)* Чалавек не толькі запамінае і паўтарае розныя звесткі пра свет. Ён абмяркоўвае іх, параўноўвае, усталёўвае паміж імі сувязі, робіць высновы. Усё гэта — мысленне (***слайд 12***). Так называецца наша наступная станцыя.

**Заданне 10. «Лішняе слова» (*слайд 13*).**

— У кожным слупку знайдзіце лішняе слова, абгрунтуйце свой выбар. Ацаніце работу.




**Заданне 11. «Адгадай крыжаванку».**

— Перад вамі пытанні, а адказы запішыце ў радкі крыжаванкі.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 **Г** | О | Р | А | Д |
| | | 2 В | Ё | С | К | **А** | | | | |
| | | | 3 С | К | А | **Р** | Ы | Н | А | |
| 4. П | Р | А | Д | С | Л | **А** | В | А | | |
| | | | 5. С | О | С | **Н** | І | Ц | А | |
| 6. П | Л | Е | Х | А | Н | **Ы** | | | | |

1. Полацк — гэта…
2. Домнікі — гэта…
3. Першадрукар, жыхар Полацка — …
4. Імя Ефрасінні Полацкай пры нараджэнні.

5. Рака ў вёсцы Гараны.
6. Вёска, у якой мы жывём.

**Заданне 12. «Дапоўні выразы».**

— Прачытайце ўважліва сказы і дапішыце словы, якія неабходныя па сэнсе.

Мінск — гэта _____ (горад), Заходняя Дзвіна — _____ (рака); Плеханы — гэта _____ (вёска), а Полацк — гэта ______ (горад); Ельня — гэта _____ (балота), Сож — гэта ____ (рака), а Нарач — ______ (возера); Палата — гэта ____ (рака), а Віцебск — _____ (горад).

— Калі вы рабілі гэты заданні, у вас працавала мысленне. Дзякуючы яму, вы ўсталёўвалі правільныя сувязі і рабілі правільныя высновы, а значыць, правільна адказвалі на пытанні.

**V. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія.**

— Вось і падышло да канца падарожжа па Краіне чалавечых магчымасцей. Прааналізуем наш маршрутны ліст. Што ўдалося, а над чым трэба яшчэ папрацаваць?

Адказы вучняў.

***Слайд 14.***

— Увага, памяць, мысленне, уяўленне працуюць разам. Дзякуючы ім чалавек пазнае свет. З іх дапамогай ён працуе, творыць, стварае новае, вынаходзіць і робіць свет багацейшым і прыгажэйшым.